*Ю. М. Лаўрык,*
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Нацыянальнага музея гісторыі*
*і культуры Беларусі*

# СТРУКТУРНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ СТАРОНКІ Ў КУЦЕІНСКІХ ВЫДАННЯХ

У навукова-даследчай літаратуры па гісторыі кнігадруку ў Куцейне традыцыйна не надавалася шмат увагі разгляду арганізацыі кніжнай старонкі. Разам з тым пры апісанні беларускіх старадрукаў бібліёграфы і кнігазнаўцы (як айчынныя, так і замежныя) зазвычай фіксавалі асноўныя характарыстыкі старонкі: памеры тэкставага блоку і колькасць слупкоў, наяўнасць рамкі, калонтытулаў, кустод і іншых элементаў[1], – а такім чынам, назапашвалі фактаграфічны матэрыял, які можа быць пакладзены ў аснову адпаведнага даследавання. Больш таго, супрацоўніца Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі А. Гусева[2] ажыццявіла спробу абагульніць характэрныя ўласцівасці кірылічнай друкаванай кнігі, выдадзенай на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у 2-й палове XVI–XVIII ст. – прычым грунтуючыся менавіта на разглядзе асобных элементаў кніжнай старонкі. Асноўным прадметам гэтай працы былі вынесеныя ў загаловак «украинские издания»; аднак даследчыца таксама актыўна звярталася да выданняў беларускіх (пачынаючы ад Скарынавых) і нярэдка, поруч з украінскімі, процістаўляла іх кнігам маскоўскага друку. Уласна гісторыя фарміравання кніжнай старонкі і яе элементаў прадстаўлена ў працы Л. І. Кісялёвай[3].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

[1] Гл., напрыклад: Каталог белорусских изданий кирилловского шрифта печати XVI–XVII вв. / ГПБ им. М. Е. Салтыкова-Щедрина; сост. В. И. Лукьяненко. – Л., 1975. – Вып. 2: (1601–1654). – 266 с.; Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI–XVIII стст. / склад. Г. Я. Галенчанка // Кніга Беларусі (1517–1917): зв. каталог / ДБЛ БССР; склад. Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 9–192, № 1–390; Симмонс, Дж. С. Г. О некоторых старопечатных кириллических книгах в Дублине / Дж. С. Г. Симмонс // Книга. Исследования и материалы: сборник. – М.: Книга, 1963. – Вып. VIII. – С. 250–251; і інш.

[2] Гусева, А. А. Идентификация экземпляров украинских изданий кирилловского шрифта 2-й пол. XVI–XVIII в. / РГБ; А. А. Гусева. – М., 1997. – 140 с.

[3] Киселева, Л. И. Западно-европейская рукописная и печатная книга XIV–XV вв.: Кодикологический и книговедческий аспект / АН СССР, Библиотека; Л. И. Киселева. – М.: Наука, 1985. – 304 с.

На нашую думку, структурныя элементы арганізацыі старонкі з увагі на іх характар мэтазгодна падзяляць на дзве асноўныя групы: *шрыфтавыя* і *аздабленчыя*.

Шрыфтавыя элементы арганізацыі старонкі – гэта ўтвораныя пры дапамозе шрыфтоў самастойныя часткі набору, кожная з якіх выконвае адмысловую функцыю. Старонкі куцеінскіх выданняў – як Собалевых, так і манастырскай друкарні – зазвычай уключаюць наступныя структурныя элементы, набраныя цалкам ці пераважна пры дапамозе шрыфтоў: *калонтытул, нумарацыю аркушаў (фаліяцыю) ці старонак (пагінацыю), тэкставы блок, сігнатуры сшыткаў, кустоды*. Такія элементы, як калонтытул і фаліяцыя/пагінацыя, не з’яўляюцца абавязковымі: яны прысутнічаюць не ва ўсіх куцеінскіх выданнях, а часам выступаюць фрагментарна – у тым ці іншым раздзеле кнігі.

*Калонтытул* служыць для абазначэння назвы кнігі і / ці яе раздзела. У куцеінскіх выданнях ён знаходзіцца ў цэнтры верхняга поля або верхняй асноўнай ячэйкі. Ён у большасці аздоблены размешчанымі паабапал адной ці некалькімі парамі элементаў наборнага арнаменту і, такім чынам, належыць аднечасова і да шрыфтавой групы элементаў, і да дэкаратыўнай. Калонтытул прысутнічае на абодвух баках аркуша, але назва ў ім можа быць разбітая на часткі, напрыклад: «Гисторїя» – пярэдні бок, «ω Варлааме и Іосафе» – адваротны. У асобных выданнях калонтытула зусім няма, што абумоўлена характарам кнігі («Буквар», 1631); у такім выпадку яго, зазвычай, замяняе кароткі цэнтраваны радок з наборнага арнаменту.

*Нумарацыя*, прызначаная для пазначэння паслядоўнасці аркушаў і старонак, у куцеінскіх друках падаецца літарамі царкоўна-славянскага алфавіта, што характэрна для тагачаснай кірылічнай кнігі. Найчасцей сустракаецца фаліяцыя (нумарацыя аркушаў), якая размяшчалася на пярэднім баку аркуша; пагінацыя (нумарацыя старонак), якая ставілася на абодвух баках, сустракаецца даволі рэдка. Думаецца, што гэта водгулле рукапіснай традыцыі, для якой фаліяцыя здаецца больш уласцівай.

Адметнасцю «Брашна духоўнага» (1639) ёсць прысутнасць у розных частках кнігі як фаліяцыі (у большасці выпадкаў), так і пагінацыі («Часаслоў», с. 253–384), або ўвогуле адсутнасць якой бы ні было нумарацыі аркушаў ці старонак («Малітвы», 16 нн арк.). Што датычыць пагінацыі ў гэтым выданні, то яна працягвае фаліяцыю з адпаведнай лічбы, і, магчыма, не планавалася выдаўцамі адмыслова, але мае сваёй прычынай замену

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наборшчыка. Адсутнасць жа нумарацыі ў «Малітвах» можа ўказваць на тое, што гэты раздзел друкаваўся большым накладам з мэтаю распаўсюджвання і асобным выданнем, накшталт таго, як у XIX – пачатку XX ст. асобна дадрукоўваліся адбіткі з часопісных артыкулаў (у літаратуры зафіксаваны падобныя факты ўжо ў супрасльскіх выданнях першай трэці XVIII ст. – напрыклад, служба святому Язафату, якая, па-за ўсялякім сумневам, з’яўляецца часткай нейкага больш аб’ёмнага выдання[4]).

На цяперашні момант нам пакуль невядомыя выпадкі асобнага выкарыстання згаданых «Малітваў», але маластаронкавыя выданні зазвычай мелі значна менш шанцаў захавацца да сённяшняга дня ў параўнанні з больш аб’ёмнымі. Акрамя таго, іх дакладнае атрыбутаванне нярэдка складае праблему, асабліва пры адсутнасці выхадных звестак – а гэта дае падставы спадзявацца, што далейшыя росшукі могуць прынесці і новыя знаходкі ў гэтай справе.

Фаліяцыя ў куцеінскіх выданнях найчасцей размяшчаецца ў верхнім полі справа, на ўзроўні краю набору. У рэдкіх выпадках яна стаіць у нізе старонкі (як, напрыклад, у «Новым Запавеце з Псалтыр’ю»). Пры рамачнай арганізацыі старонкі фаліяцыя часцей знаходзіцца ў верхняй дапаможнай ячэйцы, але калі з прычыны памеру ў апошняй не змяшчаецца, то можа прысутнічаць і ў верхняй асноўнай ячэйцы, а часам – пры наяўнасці застаўкі – нават пры тэкставым блоку. Пагінацыя размяшчаецца ў верхняй дапаможнай ячэйцы на кожным баку аркуша.

*Тэкставы блок* мае прэзентаваць асноўны тэкст як самой кнігі, так і яе дапаможных раздзелаў – такіх, як прадмова, прысвячэнне і інш. У друках Куцейны ён найчасцей прадстаўлены адной паласой набору; двухпалосны набор тут, хутчэй, выключэнне, абумоўленае характарыстыкамі асобных тэкстаў. У прыватнасці, дзве паласы набору, раздзеленыя пасярэдзіне вертыкальнай лініяй, сустракаюцца ў «Брашне духоўным» (1639) і куцеінскім перавыданні «Лексікона» Памвы Берынды (1653). У «Брашне духоўным» у дзве паласы набраныя такія часткі кнігі, як «Малітвы» (арк. 1–16 нн у сярэдзіне кнігі) і «Часаслоў» (с. 253–384). У абодвух выпадках тэкст складаецца, у значнай ступені, з адносна невялікіх падпарадкаваных тэкстаў – малітваў. Расцягванне іх на шырыню аднапалоснага набору пры ўжытым кеглі шрыфта

[4] Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI–XVIII стст. / склад. Г. Я. Галенчанка // Кніга Беларусі (1517–1917): зв. каталог / ДБЛ БССР; склад. Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 141, № 220.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прывяло б да дысгармоніі ў абліччы старонкі; павелічэнне ж кегля запатрабавала б, з аднаго боку, зрасходаваць больш паперы, а з другога – павелічэння колькасці старонак і зрабіла б кнігу нязручнай у карыстанні з прычыны празмернай таўшчыні. Трэба думаць, менавіта гэтыя меркаванні і схілілі куцеінцаў да выбару двухпалоснага набору ў названых частках «Брашны духоўнае».

Што датычыць «Лексікона», то двухпалосны набор можа быць абумоўлены тым, што размяшчэнне ў два слупкі лексіграфічнага матэрыялу, складзенага з шэрагу кароткіх слоўнікавых пазіцый, з'яўляецца больш эканамічным. Разам з тым паколькі ў нашым выпадку мы маем справу з перавыданнем, то здаецца больш лагічным гаварыць пра наследаванне надрукаванага такім чынам прататыпа.

Велічыня тэкставага блока ў куцеінскіх выданнях не залежыць ад наяўнасці рамкі ці колькасці палос набора – толькі ад фармату выдання. У друках Спірыдона Собаля набор мае наступныя памеры адпаведна фармату: *in quarto* – 140 x 114 мм («Часаслоў») і 131 x 105 мм («Актоіх»), *in octavo* – 108 x 70 мм ды 111 x 70 мм («Буквар», 1631), *in duodecimo* – 106 x 63 мм («Малітвы штодзённыя»). Фарматам *in folio* Собаль выдаў толькі «Апостал». Частка гэтага выдання, хоць і дадрукоўвалася ў Куцейне, але паводле параметраў, вызначаных выдаўцом для кнігі раней, яшчэ падчас працы ў Кіеве, – таму зараз мы гэты фармат не разглядаем.

У манастырскіх друках прыкладныя памеры тэкставага блока адпаведна складаюць: для фармату *in quarto* – 135–140 x 105 мм (большая частка выданняў), *in octavo* – 118 x 74 мм («На "Ойча наш" выклад») і 109 x 74 мм («Буквар», 1653), а *in duodecimo* – 92 x 48 мм («Дыёптра», 1651).

*Сігнатуры* патрэбныя для паслядоўнага складання надрукаваных сшыткаў у кніжны блок і прысутнічаюць на першай старонцы кожнага сшытка. Частата іх з'яўлення ў выданні залежыць, у большасці, ад фармату: паколькі сшытак у друках сярэдняга і меншага памеру ўтвараецца пры згінанні аркуша на адпаведную колькасць долей, дык і сігнатура будзе сустракацца на адной з 8 старонак, на адной з 16 і г. д. У куцеінскіх выданнях сігнатуры пазначаюцца вялікімі і малымі літарамі царкоўна-славянскага алфавіта; яны заўсёды размешчаны ў цэнтры ніжняга поля або ніжняй асноўнай ячэйкі.

*Кустоды* дубліруюць першае(-ыя) слова(-ы) наступнай старонкі, каб пры наборы не была парушана паслядоўнасць тэксту. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

куцеінскіх выданнях яны зазвычай уключаюць 5–7 знакаў і ставяцца ў ніжнім полі справа, на ўзроўні краю набору на кожнай старонцы.

*Маргіналіі* – гэта заўвагі, спасылкі, глосы і да т. п., змешчаныя на палях або, у выпадку наяўнасці рамкі, у дапаможнай ячэйцы 2 шэрагу. Месцазнаходжанне маргіналій непасрэдна прывязана да фрагмента асноўнага тэксту, які яны раскрываюць або дапаўняюць.

Дэкаратыўныя элементы арганізацыі старонкі ў айчыннай кнізе разгляданага перыяду можна падзяліць на *абавязковыя* (застаўкі, ініцыялы ды канцоўкі) і *факультатыўныя* (ілюстрацыі, маргінальныя ўпрыгожванні). Адсутнасць першых у выданні дапускаецца толькі ў выпадку, калі выдавец не мае ў сваім распараджэнні адпаведнага друкарскага матэрыялу; прысутнасць жа другіх у кнізе, у большай ці меншай ступені, залежыць ад волі кіраўніка друкарні. Усе гэтыя дэкаратыўныя элементы звязаны непасрэдна з тэкстуальнай структурай кнігі, чым і абумоўлена іх прысутнасць толькі на пэўных старонках. Коратка ахарактарызуем кожны з такіх элементаў.

*Застаўкі* прызначаны для абазначэння пачатку раздзела ў кнізе. У куцеінскіх выданнях яны сустракаюцца двух тыпаў: шырокія і вузкія; першыя, часцей за ўсё, даходзяць вышынёй да 25–35 мм, другія маюць вышыню па рамцы да 15 мм уключна. Шырокія застаўкі ўжываюцца для вылучэння асноўных, больш значных, раздзелаў тэксту, а вузкія – падпарадкаваных.

*Ініцыялы* паказваюць пачатак тэксту раздзела. Нягледзячы на разнастайнасць іх форм і памераў, выразна акрэсленых правілаў, паводле якіх ініцыялы ўжываліся ў куцеінскіх друках, не выяўлена. Разам з тым у малафарматных кнігах («Дыёптра», 1651) заўважаецца тэндэнцыя да выкарыстання меншых паводле памеру аздобаў.

*Канцоўкі* павінны пазначаць канец раздзела, але ў рэальнасці яны прысутнічаюць не заўсёды з прычыны недахопу вольнага месца. Канцоўкі куцеінскіх выданняў не вылучаюцца вялікай разнастайнасцю, а ў малафарматных адсутнічаюць амаль цалкам.

*Кніжныя ілюстрацыі* ў куцеінскіх друках, як і ўвогуле ў айчыннай кірылічнай кнізе, далёка не заўсёды насамрэч ілюструюць тэкст: гэты тэрмін ужываецца, хутчэй, дзеля адрознення сюжэтных выяў ад іншых гравіраваных аздобаў – заставак, канцовак і г. д. Так, з дзвюх выкарыстаных у Куцейне Спірыдонам Собалем гравюр – «Хрыстос з серафімамі» («Буквар», 1631) і «Ян Дамаскін» («Актоіх», выд. пасля 1632) – пэўнае дачыненне да зместу выдання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мае толькі апошняя, якая прадстаўляе партрэт аўтара кнігі; непасрэдна ж тэкст ніводная з іх не ілюструе.

Першая ў поўным сэнсе гэтага слова ілюстрацыя з’яўляецца ў куцеінскіх друках ужо толькі пасля ад’езду Собаля ў Буйнічы: гэта змешчаная ў «Гісторыі пра Варлаама і Іасафа» (1637) гравюра, якая прадстаўляе размову «тытульных» герояў аповесці пра «камень веры». Менавіта з яе распачынаецца размяшчэнне сюжэтных выяў у выданнях Куцейны непасрэдна на кніжнай старонцы побач з тэкстам. Куцеінская прытэкставая ілюстрацыйная гравюра, зазвычай, мае велічыню, удвая меншую за памеры тэкставага блоку, і размяшчаецца каля правага поля – у верхнім ці ніжнім куце – або нават пасярэдзіне старонкі. І хоць традыцыйнае, «франтыспіснае», знаходжанне партрэтаў яшчэ доўга захоўвае свае пазіцыі ў літургічных («Актоіх») і «боганатхнёных» («Новы Запавет з Псалтыр’ю») кнігах, аднак з выхадам «Гісторыі пра Варлаама і Іасафа» друк на нашых землях узбагаціўся ў новы прыём[5], каторы ад таго часу спарадычна сустракаецца як у пазнейшых куцеінскіх («Трыфалагіён»), так і ў іншых айчынных (напрыклад, магілёўскіх) выданнях.

*Маргінальныя ўпрыгожванні* для куцеінскіх друкаў не вельмі характэрны, што абумоўлена выпускам друкарняй сярэдне- і малафарматных выданняў пры амаль выключным выкарыстанні рамачнай арганізацыі старонкі, якая дазваляла ўжываць толькі невялікія аздобы, і тое пры адсутнасці тэкставых маргіналій. Тым не менш такога роду аздобы часам сустракаюцца і ў выданнях Куцейны; па сутнасці, яны з’яўляюцца графічным адпаведнікам тэкставых заўваг, прызначаных падкрэсліць важнасць таго ці іншага месца ў тэксце – кшталту «Зри» або «NB (= nota bene)».

Паводле тэхнікі выканання дэкаратыўныя элементы можна падзяліць на літыя і гравіраваныя. Да першых належаць аздобы, утвораныя пры дапамозе літага наборнага арнаменту, да другіх – ксілаграфічныя, то бо гравіраваныя на дрэве. Падрабязнаму разгляду кожнай з дзвюх названых груп будуць прысвечаны адмысловыя артыкулы.

Колькасць фарбаў і спосаб каляровага друку. Спірыдон Собаль, а за ім і манастырскія выдаўцы ў сваёй практыцы ўжывалі друк як у

[5] Праўда, ілюстрацыі на кніжных старонках можна сустрэць ужо ў Скарынавых выданнях, дзе яны, знаходзячыся ў пачатку біблійных кніг, выконваюць ролю своеасаблівых заставак. Толькі асобныя гравюры Скарыны (напрыклад, выява цара Давіда на с. 1 «Псалтыры»), размешчаныя наўзбоч тэксту, можна разглядаць як праўобраз куцеінскіх ілюстрацый. Пасля Скарыны гэты прыём не выкарыстоўваўся ў айчынным кірылічным друку больш за стагоддзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адну, так і ў дзве фарбы. Літаратура чэційнага характару зазвычай друкавалася толькі чорнай фарбай («Буквар» Собаля, «Гісторыя пра Варлаама і Іасафа» манастырскай друкарні). Выданні ж, прызначаныя для ўжывання ў царкве (куцеінскія «Часаслоў» і «Актоіх» Собаля, «Анфалагіён» манастырскай друкарні), а таксама «Новы Запавет з Псалтыр’ю» як кніга, натхнёная Богам, аздабляліся больш урачыста, для іх характэрна вылучэнне загалоўкаў і падзагалоўкаў, ініцыялаў і іншых элементаў тэксту ды аздабленне чырвонай фарбай.

Двухколерны друк прысутнічае, галоўным чынам, на першых старонках кніг. У сярэдзіне кніжнага блока яго можна пабачыць радзей – напрыклад, у пачатковых аркушах «Евангелляў» з «Новага Запавету з Псалтыр’ю», дзе дзве фарбы ўжыты з прычыны асаблівага статусу гэтых кніг (напрыклад, першыя старонкі «Дзеяў апостальскіх» у тым самым выданні друкаваны ўжо толькі чорным колерам).

Адсутнасць змяшэння фарбаў на старонцы і накладанне чырвонага колеру на чорны (як, напрыклад, у «Евангеллі паводле Матфея» з асобніка НГМ РБ[6]) сведчыць, што двухколерны друк ажыццяўляўся куцеінцамі ў два прыёмы: найперш чорнай фарбай, затым – чырвонай. Рэдкасць выпадкаў накладання колераў сведчыць пра даволі высокі прафесійны ўзровень супрацоўнікаў друкарні.

Падсумуем. Вывучэнне выданняў куцеінскага друку дазваляе сцвярджаць аб наяўнасці пэўных тэндэнцый у прадстаўленні тэксту і аздабленні разгляданых кніг, большасць з якіх уласцівыя для тагачаснай айчыннай кніжнай культуры ўвогуле. Такім чынам, паводле свайго знешняга выгляду і арганізацыі старонкі куцеінская кніга характарызуецца тымі ж рысамі, што і ўвогуле айчынная кірылічная кніга разгляданага перыяду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[6] КП 10278/23, арк. 5 2-й фаліяцыі.